■ У полі зроку

# КУЛЬТУРА НЕ МОЖА ЦАЛКАМ СЯБЕ ФІНАНСАВАЦЬ,

## але ў Маладзечанскім раёне вучацца зарабляць самастойна

**У наступным годзе Маладзечна стане культурнай сталіцай Беларусі. Дадам, што горад заўсёды называлі некаранаванай сталіцай культуры Міншчыны. Штогод тут праходзіць безліч мерапрыемстваў як мясцовага, так і рэспубліканскага ўзроўняў. Бясспрэчна, без адукаваных прафесійных кадраў, без маральнай і матэрыяльнай падтрымкі з боку ўлады творчыя дасягненні не былі б настолькі значнымі. Да такой высновы прыйшлі ўдзельнікі выязнога пасяджэння Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці.**

У хуткім часе ў Беларусі з'явіцца Кодэкс аб культуры. Пасля разгляду ў другім чытанні праект дакумента паступіць у Верхнюю палату — Савет Рэспублікі.

— Нам хацелася больш глыбока вывучыць пытанне на прыкладзе Маладзечанскага раёна, улічваючы, што ў сацыяльнай сферы дзяржава робіць шмат, — канстатаваў **старшыня Пастаяннай камісіі Мікалай КАЗАРАВЕЦ.** — Штогод на сацыяльную сферу выдаткоўваецца 12,5% сродкаў ад валавога ўнутранага прадукту. Гэта вельмі значная сума, і мы павінны разумець, як выкарыстоўваюцца гэтыя асігнаванні. Каля 70% — гэта выдаткі мясцовага бюджэту. Гэта, лічу, вельмі правільна, таму што рэгіянальныя ўлады бачаць праблемы зблізку, разумеюць, куды лепш укладваць грошы.

На рамонт аб'ектаў культуры Маладзечаншчыны летась было выдаткавана 2980,8 млн рублёў. Найбольш іх выкарыстана на ўпарадкаванне будынка дзіцячага цэнтра культуры «Расток». Цяпер рамантуецца раённая цэнтральная бібліятэка імя Максіма Багдановіча. Летась былі набыты мікрааўтобус, музычныя інструменты, касцюмы для калектываў мастацкай творчасці, камп'ютарнае, светлавое і акустычнае абсталяванне, мэбля... Райвыканкамам распрацавана рэгіянальная праграма па ахове гісторыка-культурных каштоўнасцяў на 2012-2016 гады. У гэтым кірунку ўжо шмат зроблена.

— Маладзечанскі раён — адзін з лідараў Мінскай вобласці ў плане культурнага развіцця, — лічыць **першы намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Мінскага аблвыканкама Святлана БАРАНОК.** — Тут многія ўстановы маюць моцную матэрыяльную базу і кваліфікаваныя прафесійныя кадры.

Але, падкрэсліла Святлана Аляксандраўна, культура не можа быць цалкам на самафінансаванні — такога няма нідзе ў свеце. Разам з тым на Міншчыне імкнуцца, каб доля пазабюджэтных паступленняў пастаянна павялічвалася. І ў гэтым плане Маладзечанскі раён паказальны. У сярэднім па вобласці за 9 месяцаў гэтага года колькасць пазабюджэтных паступленняў у агульным утрыманні галіны — 8,3%. У Маладзечанскім раёне — 12,7%. Інакш кажучы, тут самастойна зарабілі 5,2 млрд рублёў. Уменне зарабляць грошы, разуменне таго, за якія культурныя паслугі чалавек можа сёння заплаціць, — гэты вопыт маладзечанцаў варты таго, каб яго распаўсюдзіць у іншых рэгіёнах.

**Культура не можа быць цалкам на самафінансаванні — такога няма нідзе ў свеце. Разам з тым на Міншчыне імкнуцца, каб доля пазабюджэтных паступленняў пастаянна павялічвалася. І ў гэтым плане Маладзечанскі раён паказальны.**

Што датычыцца аптымізацыі, то сёння закрываюцца ўстановы неплацежаздольныя, куды не ідуць людзі, дзе слабая матэрыяльная база, кадры. У такім выпадку ставіцца пытанне: ці патрэбна такая ўстанова? Установы, дзе ўмеюць працаваць, зацікавіць людзей, маюць права на жыццё. І гэта не толькі паказ канцэртных праграм і тэатральных пастановак. Спектр платных паслуг нашмат шырэйшы: грошы зарабляюць і музеі, і бібліятэкі, і сельскія клубы.

Пытанні кадравага забеспячэння ў галіне культуры знаходзяцца ў полі зроку кіраўніцтва раёна, у тым ліку — замацаванне маладых спецыялістаў, стварэнне ўмоў для іх працы і пражывання. У 2014—2015 гадах у Маладзечна і раён было размеркавана 15 спецыялістаў. І амаль усе яны засталіся тут.

У Маладзечне працуюць дзве сярэднія спецыяльныя навучальныя ўстановы, якія рыхтуюць спецыялістаў для культурнай галіны: дзяржаўны музычны каледж імя М.К. Агінскага і гімназія-каледж мастацтваў. Пасля іх заканчэння выпускнікі, як правіла, атрымліваюць у далейшым вышэйшую адукацыю ў кансерваторыі, іншых навучальных установах. Праз кожныя пяць гадоў у раёне чакаюць прытоку новых спецыялістаў.

— Мы пад вялікім уражаннем ад таго, як развіваецца культура ў рэгіёне, — падсумаваў вынікі пасяджэння Мікалай Казаравец. — Тут мы не ўбачылі нейкіх глабальных праблем. Пытанні вырашаюцца правільна і эфектыўна. І вопыт Маладзечанскага раёна варта перанесці на іншыя раёны краіны.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.**
*lazovskaya@zviazda.by*

■ Ці чулі?

## ДАПАМОГУ ПА БЕСПРАЦОЎІ ПАВЫСЯЦЬ У ВОСЕМ РАЗОЎ,

### але толькі з 2018 года

**Пра тое, што ў перспектыве плануецца зраўняць выплаты па беспрацоўі з памерам бюджэту пражытачнага мінімуму, паведаміў начальнік упраўлення палітыкі занятасці Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Алег ТОКУН. «Чаму прынята такое рашэнне? Напэўна, час прыйшоў. Трэба будзе распрацаваць сістэму. Памер дапамогі будзе дыферэнцыравацца ў залежнасці ад прычыны звальнення, выплаты страхавых узносаў. Вядома, на гэта спатрэбяцца дадатковыя грошы», — пракаментаваў спецыяліст.**

Цяпер максімальны памер дапамогі па беспрацоўі складае дзве базавыя велічыні. Бюджэт пражытачнага мінімуму ў сярэднім на чалавека — крыху больш за паўтара мільёна. Адкуль возьмуць неабходныя сродкі, каб з 2018 года зраўняць гэтыя памеры, пакуль не вызначылі. Магчыма, выплаты падымуць за кошт бюджэту ці Фонду сацабароны насельніцтва. Або дапамогу на выпадак незанятасці сабе забяспечаць самі работнікі, за свае грошы (праз укараненне механізма страхавання ад беспрацоўя). Варыянты прадставяць перад урадам і ўжо на дзяржаўным узроўні вырашаць, як будзе выглядаць сістэма падтрымкі незанятых грамадзян.

Па словах Алега Токуна, рабіць больш жорсткім падыход да пастаноўкі на ўлік у сувязі з павелічэннем дапамогі не плануецца.

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.**
*lubneuskaya@zviazda.by*

■ Харчовая бяспека

# БАГАТАЯ ВОСЕНЬ

**Уборачная кампанія завяршылася паспяхова, нават нягледзячы на засушлівы год. Харчовая бяспека краіны цалкам забяспечана. Дзяржзаказ па пастаўках збожжа выканаңы на 101%. Закладзены стабілізацыйны фонд. Жывёлагадоўля таксама не адстае. Напрыклад, тэмпы росту вытворчасці малака склалі 107% да леташняга ўзроўню, жывёлы і птушкі — 107,1%.**

### ЦВЁРДАЙ ПШАНІЦЫ ЎДОСТАЛЬ

Па словах **намесніка міністра сельскай гаспадаркі і харчавання Уладзіміра ГРАКУНА**, краіна забяспечвае сябе пшаніцай цвёрдых гатункаў у неабходных аб'ёмах, таму не будзе яе імпартаваць. «У гэтым годзе мы атрымалі сваю пшаніцу цвёрдых гатункаў у аб'ёмах, якія дазваляюць цалкам забяспечыць мукамольную прамысловасць», — растлумачыў ён. Аднак у Беларусь працягнуць імпартаваць некаторыя напаўняльнікі, напрыклад клейкавіну.

### ЭКСПАРТ З ПЛЮСАМ

Як адзначаюць у Міністэрстве сельскай гаспадаркі і харчавання, па выніках 2015 года аб'ём экспарту чакаецца на ўзроўні 2,3 млрд долараў.

Так, па даных на 5 лістапада, экспартавана ўжо больш за 260 тысяч тон бульбы, што больш чым летась, калі была пастаўлена 171 тысяча тон. Морквы было пастаўлена 83 тысячы тон, што больш чым у мінулым годзе на 24 тысячы тон, цыбулі — 16 тысяч тон (у 2014 годзе — 1,8 тысячы тон), буракоў — 14,4 тысячы тон (7 тысяч тон), капусты белакачаннай — 44 тысячы тон (19,5 тысячы тон), таматаў закрытага грунту — 47 тысяч тон (37 тысяч тон), яблыкаў — 32 тысячы тон (14,8 тысячы тон).

Гаворачы аб экспарце жывёлагадоўчай прадукцыі, Уладзімір Гракун адзначыў, што на фоне зніжэння аб'ёмаў экспарту ў коштавым выражэнні не адбылося зніжэння ў натуральным.

«У сувязі са зніжэннем кошту прадукцыі мы недаатрымалі грошы, нягледзячы на павелічэнне аб'ёмаў паставак. Тэмп росту экспарту малака і малакапрадуктаў у натуральным выражэнні за студзень — жнівень 2015-га да аналагічнага перыяду 2014 года склаў 124%, у тым ліку сыру і тварагу — 113, 9%, сухога абястлушчанага малака — 142,6%, сухога неразведзенага малака — 117,9%, алею — 144,8%, мяса і птушкі — 102,8%», — удакладніў намеснік міністра.

Асноўным рынкам збыту беларускай сельгаспрадукцыі, як і раней, застаецца Расія — каля 80% усіх паставак. «Мы працуем над дыверсіфікацыяй экспарту сельгаспрадукцыі, але і нашы вытворцы павінны разумець, што ім трэба таксама самім шукаць рынкі збыту. Беларусь сёння пастаўляе сваю сельгаспрадукцыю ў 60 краін свету», — растлумачыў Уладзімір Гракун.

### СЕРТЫФІКАТЫ Ў ПАРАДКУ

Пытанняў да фітасанітарных сертыфікатаў беларускай прадукцыі з расійскага боку няма.

«Падробленых беларускіх фітасанітарных сертыфікатаў не было і няма. У Расельгаснагляда былі пытанні да сертыфікатаў прадукцыі іншых краін, якія пастаўляюцца ў Расію праз Беларусь. У нас працуем з іх фітасанітарнымі службамі практычна па кожным такім выпадку», — адзначыў Уладзімір Гракун.

Былі моманты, калі пацвярджалася інфармацыя аб падробленых сертыфікатах з іншых краін: «У такіх выпадках краіны на месцах праводзяць расследаванне, правяраюць фірмы, якія экспартавалі такую прадукцыю. І ў далейшым гэтыя фірмы мы не пускаем праз Беларусь».

**Ілья КРЫЖЭВІЧ.** *kryzhevich@zviazda.by*

# ФАКТАР КАНКУРЭНТАЗДОЛЬНАСЦІ

## Сёлета Сусветны дзень якасці адзначаецца 12 лістапада і праходзіць пад дэвізам «Якасць — эмоцыі — натхненне»

**У айчынных вытворцаў і спажыўцоў ёсць нагода лічыць сябе непасрэдна далучанымі да міжнароднага свята. «У нашай краіне створана і падтрымліваецца на сучасным узроўні шматпланавая інфраструктура якасці як неад'емны элемент дзяржаўнай эканамічнай палітыкі. Яна ўключае такія напрамкі, як тэхнічнае нармаванне і стандартызацыя, метралогія, ацэнка адпаведнасці і акрэдытацыя, эканомія рэсурсаў, а таксама падтрымка, матывацыя і прасоўванне ідэалогіі комплекснай якасці і дзелавой дасканаласці», — адзначылі ў прэс-службе Дзяржстандарта. З паглыбленнем еўразійскай інтэграцыі і ўступленнем асноўных гандлёва-эканамічных партнёраў у СГА Дзяржстандартам вядзецца работа па пераглядзе асобных законаў на прадмет адпаведнасці патрабаванням тэхнічных нарматыўных прававых актаў у галіне тэхнічнага нармавання і стандартызацыі». Адпаведныя праекты ўжо распрацаваны і праходзяць працэдуры ўнутрыдзяржаўнага ўзгаднення.**

У Дзяржстандарце таксама адзначылі, што на сёння на стадыі ўнутрыдзяржаўнага ўзгаднення знаходзіцца 11 праектаў тэхнічных рэгламентаў Мытнага саюза (па бяспецы будынкаў і збудаванняў, будаўнічых матэрыялаў і вырабаў, атракцыёнаў, абсталявання для дзіцячых гульнявых пляцовак, мінеральных угнаенняў, алкагольнай прадукцыі, рыбы і рыбнай прадукцыі, пакаванай пітной вады і інш.). Яшчэ чатыры праекты праходзяць публічнае абмеркаванне: па бяспецы мяса птушкі, нафты, прадукцыі, прызначанай для абароны насельніцтва пры надзвычайных сітуацыях прыроднага і тэхнагеннага характару, а таксама прадукцыі, прызначанай для грамадзянскай абароны.

Неад'емнай часткай нацыянальнай эканомікі з'яўляюцца стандарты. У рэспубліцы за 9 месяцаў гэтага года прынята больш за 1200 дзяржаўных стандартаў (СТБ і ДАСТ). Важным прынцыпам з'яўляецца гарманізацыя патрабаванняў дзяржаўных стандартаў з міжнароднымі і еўрапейскімі. Так, узровень гарманізацыі штогод складае больш за 60%. Цяпер у нас дзейнічае звыш 25 000 дзяржаўных стандартаў. Забяспечыць прасоўванне айчыннай прадукцыі на знешнія рынкі без дадатковых працэдур ацэнкі адпаведнасці дапамагае Нацыянальная сістэма акрэдытацыі, прызнаная на міжнародным узроўні.

У Дзяржстандарце адзначаюць, што ў нашай краіне за апошнія дзесяцігоддзе праведзена вялікая праца па ўжыванні сістэмнага падыходу да кіравання рознымі аспектамі дзейнасці арганізацый. Так, у арганізацыях рэспублікі сертыфікаваны сістэмы менеджменту якасці па ISO 9001, сістэмы менеджменту бяспекі харчовых прадуктаў на адпаведнасць патрабаванням ISO 22000, сістэмы кіравання аховай навакольнага асяроддзя па ISO 14001 і інш.

Развіваецца рэспубліканскі конкурсны рух у галіне якасці. Сёлета аб'яўлены і праводзяцца конкурсы на саісканне прэміі ўрада Рэспублікі Беларусь за дасягненні ў галіне якасці, «Найлепшыя тавары Рэспублікі Беларусь на рынку Расійскай Федэрацыі», «Найлепшыя тавары Рэспублікі Беларусь», «Найлепшы менеджар па якасці», «Найлепшая дыпломная і навукова-даследчая праца студэнтаў у галіне менеджменту і кантролю якасці».

У рамках Еўрапейскага тыдня якасці (9—15 лістапада) і Сусветнага дня якасці арганізацыі Дзяржстандарта ва ўсіх рэгіёнах краіны праводзяць каля 70 мерапрыемстваў рознага фармату. Атрымаць адказы на хвалюючыя пытанні можна будзе, звярнуўшыся на прамыя тэлефонныя лініі ў цэнтрах стандартызацыі, метралогіі і сертыфікацыі (ЦСМС) у Брэсце, Баранавічах, Барысаве, Віцебску, Гродна, Магілёве. Дні адчыненых дзвярэй і дні якасці праводзяць БелДІСС, БелДІМ, БГЦА, Баранавіцкі, Бабруйскі, Барысаўскі, Гродзенскі, Калінкавіцкі, Магілёўскі, Полацкі, Слуцкі ЦСМС, Цэнтр выпрабаванняў і сертыфікацыі ТООТ.

Больш падрабязную інфармацыю можна знайсці на сайце Дзяржстандарта (www.gosstandart.gov.by) у тэматычным банеры.

**Дар'я ШОЦІК.**